**І.Г.Лупашка,** *аспірантка*

# МУЗЕЙНА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ ЗАНЯТКІ ЯК АДНА З ФОРМАЎ КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ЛІТАРАТУРНЫХ МУЗЕЯЎ (у ракурсе сусветных тэндэнцый)

Вялікую папулярнасць у апошні час набывае такая форма працы, як музейна-педагагічныя заняткі. Яны распрацоўваюцца для пэўнай аўдыторыі з улікам яе псіхолага-педагагічных характарыстык і садзейнічаюць паглыбленню ведаў наведвальніка па пэўнай тэме. Вельмі важна, што пры гэтым наведвальнікі з'яўляюцца актыўнымі раўнапраўнымі ўдзельнікамі працэсу камунікацыі. Як зазначаюць работнікі музеяў, эфектыўнасць такіх заняткаў тым большая, чым больш яны адрозніваюцца ад школьнага ўрока.

Першынство ў распрацоўцы музейна-педагагічных заняткаў у Беларусі належыць музеям не літаратурнага профілю. Найбольш актыўна выкарыстоўваецца такая форма работы ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі і Нацыянальным мастацкім музеі, а таксама Полацкім гісторыка-культурным запаведніку. Тым не менш літаратурныя музеі таксама распачалі актыўную дзейнасць у гэтым кірунку. Цікава, што "піянерамі" ў працэсе стварэння музейных заняткаў сярод літаратурных музеяў з'яўляюцца не сталічныя буйныя музеі. Так, адзіным навуковым супрацоўнікам музея К.Чорнага, што ў в.Цімкавічы Капыльскага раёна (філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры), распрацаваны цыкл музейна-педагагічных заняткаў, якія выдадзены асобным зборнікам у серыі "Музейныя сшыткі".

Сярод мінскіх літаратурных музеяў лідэрам па стварэнні музейна-педагагічных заняткаў з'яўляецца Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры. За перыяд 2003–2007 гг. супрацоўнікамі гэтага музея распрацаваны 9 музейна-педагагічных заняткаў [1; 4]. Некаторыя з заняткаў разлічаны на дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Папярэдняму знаёмству з музеем і музейным асяроддзем прысвечаны музейна-педагагічныя заняткі "Таямніцы музейных сховішчаў". Адна з асноўных задач гэтых заняткаў – падрыхтоўка школьнікаў да першага наведвання музея. Вучням тлумачацца асноўныя музейныя паняцці, даецца ўяўленне аб паводзінах у межах музея, расказваецца аб працы музейных

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

супрацоўнікаў. Падабраны адпаведны прадметны рад, які дазваляе ўзбагаціць эмацыянальную сферу, што вельмі значна для малодшага школьнага ўзросту. Граматна пабудаваны ход заняткаў: расказ і паказ, дыялог-гульня, творчае замацаванне матэрыялу. Заняткі “Як хлеб да нас на стол прыйшоў” створаны ў форме казкі (выкарыстана беларуская народная казка “Лёгкі хлеб”), дзеці самі актыўна ўдзельнічаюць у працэсе “стварэння хлеба”, адгадваюць загадкі і ў ходзе гульні запамінаюць назвы прылад працы, гаспадарчых дзеянняў. Прадметны рад складаецца з аўтэнтычных музейных прадметаў, муляжоў сельскагаспадарчых прылад працы, ілюстрацый.

Станоўчым у музейна-педагагічных занятках з’яўляецца тое, што гэтая форма дзейнасці можа выкарыстоўвацца для розных узроставых катэгорый наведвальнікаў.

Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры прапануе сваім наведвальнікам таксама заняткі, разлічаныя на сярэдні школьны ўзрост. На занятках па тэме “Наш нацыянальны касцюм” школьнікі знаёмяцца з беларускай вопраткай, нацыянальным касцюмам, які яны маюць магчымасць пабачыць самі. Заняткі праводзяцца ў форме дыялогу з элементамі гульні. Мэта іх – далучыць дзяцей да багатай гісторыі, культуры, традыцый роднага краю.

Для падлеткавай аўдыторыі падрыхтаваны заняткі “Як жылося буквару ў розныя часы”, якія праводзіліся ў перыяд дзейнасці выставы “Ад А да Я – з гісторыі буквара”. На гэтых занятках падлеткі знаёміліся з букварам не толькі як з падручнікам для першапачатковага навучання, але і як са своеасаблівым падручнікам гісторыі. На час заняткаў наведвальнікі выконвалі ролю музейных супрацоўнікаў і самі дапаўнялі выставу музейнымі прадметамі, а таксама праводзілі экскурсіі. Адной з задач распрацоўкі заняткаў было навучыць наведвальніка самастойна здабываць інфармацыю з матэрыялаў выставы. У выніку без папярэдняга праслухоўвання экскурсіі школьнікі авалодваюць той жа інфармацыяй, якую яны б маглі атрымаць ад экскурсавода. Але пры гэтым яны не пасіўныя гледачы і слухачы, а актыўныя ўдзельнікі ў працэсе здабывання інфармацыі.

Неабходна адзначыць, што пры рабоце з наведвальнікамі сярэдняга школьнага ўзросту ўзнікаюць пэўныя складанасці – падлеткі не заўсёды ідуць на кантакт з музейным педагогам. Адной з прычын гэтага можна назваць псіхалагічныя асаблівасці дадзенага ўзросту. Акрамя таго, падлеткі не былі арыентаваны на становішча

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

наведвальніка як паўнапраўнага суб'екта музейнай камунікацыі; ім была прывіта ўстарэлая мадэль музейнай культуры: "паводзіць сябе прыстойна, слухаць уважліва, рукамі не дакранацца".

Музейна-педагагічныя заняткі прапануюць сталічным школьнікам Літаратурна-мемарыяльны дом-музей Я.Коласа і Літаратурны музей Я.Купалы. Распачалася такая дзейнасць у Літаратурным музеі М.Багдановіча.

Заўважым, што музейныя заняткі адрозніваюцца ад школьных не толькі тым, што яны праводзяцца музейным педагогам. На музейных занятках абавязкова прысутнічае музейны прадмет – сапраўдны сведка даўніны, які наведвальнікі могуць не толькі ўбачыць, але і патрымаць у руках і такім чынам наблізіцца да мінулага, эмацыянальна адчуць яго. Звычайна на такіх занятках выкарыстоўваюцца музейныя прадметы з навукова-дапаможнага фонду музея.

Адзначым, што ў музейна-педагагічным кірунку беларускія літаратурныя музеі дзейнічаюць у рэчышчы сусветных тэндэнцый. Гэта пацвярджае параўнанне сучасных формаў работы з наведвальнікамі музеяў розных краін.

Распрацоўка музейна-педагагічных заняткаў для дзяцей праходзіць у розных напрамках. Гэта могуць быць гісторыя населенага пункта, у якім знаходзіцца музей; агульнамузейная тэматыка; профільная тэматыка, а таксама тэмы, якія адпавядаюць пэўным выставам. Напрыклад, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры прапануе сваім маленькім наведвальнікам уводныя заняткі "Таямніцы музейных сховішчаў", Гістарычны музей г. Білефельда (Германія) – заняткі "Was machen die im Museum eigentlich?" ("Чым менавіта займаюцца ў музеі?"), а Яраслаўскім дзяржаўным гісторыка-архітэктурным музеем-запаведнікам распрацавана праграма "Знаёмцеся, музей!".

Папулярнай для распрацоўкі музейна-педагагічных заняткаў з'яўляецца этнаграфічная тэматыка. Музей гісторыі горада Яраслаўля запрашае малодшых школьнікаў на заняткі "З бабулінага куфэрка", дзе вучні даведваюцца аб даўніх назвах адзення, вучацца шыць традыцыйны сарафан. Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры прапануе заняткі "Наш нацыянальны касцюм". Аналагічную тэматыку ("Aus bunten Faden gewebt" – "Самастойна саткана з рознакаляровых нітак") распрацавалі музейныя работнікі г. Білефельда [3].

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Характэрна, што ўсе прапануемыя формы працы для маленькіх наведвальнікаў маюць гульнявую аснову. Гэта цікава, што аптымальна для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

Але ж у арганізацыі музейна-педагагічнай дзейнасці розных краін ёсць свая спецыфіка. Беларускія і пераважна расійскія літаратурныя музеі ствараюць свае музейна-педагагічныя заняткі для арганізаваных груп дзяцей, імкнуцца да стварэння доўгатэрміновых праграм, цесна супрацоўнічаюць са школай. Музеі далёкага замежжа разлічваюць свае мерапрыемствы пераважна на індывідуальных ці сямейных наведвальнікаў, якіх чакаюць у музеі ў выхадныя дні ці ў спецыяльна акрэслены час у будні. З аднаго боку, гэта стварае дадатковыя зручнасці для наведвальнікаў: не трэба чакаць арганізаванага паходу ў музей з класам, а можна наведаць яго самастойна або з бацькамі. З другога боку, узнікаюць пэўнага роду складанасці: колькасць удзельнікаў кожны раз можа быць рознай, можа сабрацца рознаўзроставая аўдыторыя, для якой неабходна выкарыстанне розных метадаў і формаў працы. Для таго каб арганізаваць абслугоўванне наведвальнікаў на якасным узроўні, трэба наладзіць “дзяжурства” некалькіх супрацоўнікаў, што нерэнтабельна. Замежныя музеі вырашаюць гэтую праблему з дапамогай валанцёраў [3]. Ёсць і яшчэ адна адметнасць у арганізацыі музейна-педагагічных заняткаў беларускімі літаратурнымі музеямі: у асноўным яны выкарыстоўваюцца як пазамузейная форма работы. Гэта абумоўлена некалькімі прычынамі, у першую чаргу тэхнічнага характару. Пераважная большасць беларускіх літаратурных музеяў не маюць свабоднай экспазіцыйнай плошчы, каб абсталяваць спецыяльную музейна-педагагічную прастору. Па-другое, амаль усе літаратурныя музеі, якія прапаноўваюць музейна-педагагічныя заняткі, знаходзяцца ў г.Мінску, а асноўныя спажыўцы гэтага музейнага прадукту – малодшыя школьнікі, якім складана дабірацца да музея. Такім чынам, каб не страціць аўдыторыю, музеі вымушаны праводзіць музейна-педагагічныя заняткі ў школах.

На наш погляд, арыентацыя музея на сферу вольнага часу насельніцтва (рэкрэацыйная функцыя), якая выяўляецца ўжо сёння, будзе яшчэ больш пашырацца. У выніку будзе пашырацца і дзейнасць музеяў па распрацоўцы музейна-педагагічных заняткаў, паколькі яны спалучаюць разам з адукацыйным і забаўляльны

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

кампанент, што карыстаецца найбольшым попытам у наведвальнікаў музея.

___


1. *Аб дзейнасці* Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры за перыяд 2004–2006 гг.: даведка // Бягучы архіў ДМГБЛ. – Мн., 2007.

2. *Музейная* педагогіка. Праблемы арганізацыі музейнай работы з дзецьмі: навук.-метад. зб. / уклад. В.У.Міронччык. – Мн.: БелІПК, 1997. – 71 с.

3. *Озерова, Д.Е.* Современные формы работы с посетителями музеев Германии и России / Д.Е.Озерова [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.yspu.yar.ru/vestnik/novye_issledovaniy/14_5. – Дата доступа: 07.02.2007.

4. *Справаздача* Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры за 2007 год // Бягучы архіў ДМГБЛ. – Мн., 2008.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ